# СЕКЦИЯ «ТАМОЖЕННОЕ ДЕЛО НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ: ТЕОРИЯ И ПРАКТИКА»

## КІРАЎНІКІ МІНСКАЙ МЫТНІ НАПРЫКАНЦЫ XV — НАПАЧАТКУ XXI стст.

***В. А. Астрога***
*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости,4, 220030, г. Минск, Беларусь, e-mail: ostroga.v@mail.ru*

*В исследовании на основаннии анализа исторических источников и специальной литературы представлены и кратко охарактеризованы 48 персоналий руководителей Минской таможни за период с конца XV до начала XXI в. Особое внимание уделено периоду Великого княжества Литовского (21 человек), БССР (16 человек), Республики Беларусь (10 человек). Сделан вывод, что именно руководитель формирует и направляет коллектив успешной таможни, о чем свидетельствует исторический опыт. Обоснована и предложена обновленная дата создания Минской таможни — 21 марта 1499 г.*
***Ключевые слова:*** *Беларусь; таможенное дело; таможенная служба; таможня; руководитель; начальник; профессионализм; управление.*

## THE HEADS OF THE MINSK CUSTOMS IN THE LATE XV—EARLY XXI CENTURIES

***V. A. Astroha***
*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, e-mail: ostroga.v@mail.ru*

*In the study, based on the analysis of historical sources and special literature, 48 personalities of the heads of the Minsk customs for the period from the end of the XV to the beginning of the XXI centuries are presented and briefly characterized. Special attention is paid to the period of the Grand Duchy of Lithuania (21 people), the BSSR (16 people), the Republic of Belarus (10 people). It is concluded that it is the head who forms and directs the staff of a successful customs, as evidenced by historical experience. The updated date of creation of the Minsk customs — March 21, 1499 is justified and proposed.*
***Keywords:*** *Belarus; customs affair; customs service; customs office; head; head; professionalism; management.*

Роля асобы ў гісторыі як вядома вялізарна. Так і ў беларускай мытнай гісторыі заўсёды была вельмі значнаю роля кіраўніка мытні, бо паспяховы кіраўнік рабіў яе таксама паспяховай. Гісторыя Мінскай мытні багатая на гэткія прыклады, асабліва ў найноўшы час. У межах артыкула не магчыма асвятліць жыццёвы і прафесійны шлях ўсіх кіраўнікоў сталічнай мытні, таму наша мэта абазначыць гэтую праблему і прааналізаваць маловядомую зараз цікавую і павучальную старонку беларускай мытнай гісторыі. На сёння спецыяльных публікацый па гэтай тэме

амаль няма. Першым, хто пачаў вывучэнне біяграфій мытных кіраўнікоў стаў мытнік і краязнавец В. Ю. Саяпін [1]. Аднак, уласна аб кіраўніках Мінскай мытні стала можна даведацца толькі сёлета з выхадам у свет манаграфіі В. А. Астрога і С. В. Іванова «Гісторыя Мінскай рэгіянальнай мытні» [2]. Гэта дазваляе сцвярджаць, што тэма мае высокі ўзровень навуковай актуальнасці і навізны.

На сёння нам вядома прозвішчы 48 чалавек, якія ў розныя часы з 1489 г. па сённяшні час ўзначальвалі Мінскую мытню. Нажаль, пакуль мы не маем поўнага спіса. У цемры гісторыі застаюцца імёны мінскіх мытнікаў XI — XV стст., а таксама XVII—XVIII стст. Разам з тым, нам атрымался высветліць прозвішчы мытных кіраўнікоў XVI ст., XX ст. і, канешне, перыяда Рэспублікі Беларусь. У дадзеным даследаванні прааналізаваны спіс кіраўніцтва Мінскай мытні і іх уклад у развіццё мытнай справы ў межах наступных гістарычных перыядаў — Вялікае Княства Літоўскае, БССР і Рэспубліка Беларусь. Трэба значыць, што ў часы знаходжання беларускіх земляў у складзе Расійскай імперыі мытня не існавала.

**Вялікае Княства Літоўскае (канец XV—XVI стст., другая палова XVIII ст.).** За разглядаемы гістарычны перыяд нам вядома аб дзейнасці 21 мытніка, як тады называлі кіраўнікоў мытнай каморы. Некаторыя з іх кіравалі каморая два і нават тры разы. У Мінску, даўнім буйным асяродку транзітнага гандлю, працавала мытная камора. Яна належала вялікакняжаскаму скарбу і здавалася ў арэду за грошы (прыватнае кіраванне) альбо перадавалася рашэннем Вялікага князя ў «верныя рукі» (дзяржаўнае кіраванне). Адсутнасць крыніц не дазваляе дакладна казаць хто быў «першым мытнікам менскім». Але ў сярэдневяковым дакуменце 1387 г., які адлюстроўвае дараванне Вялікім князем Ягайла свайму брату Скіргайла земляў у цэнтральных і ўсходніх частках сучаснай Беларусі ўзгадваецца «горад Менеск весь і з усімі людзьмі і з зямлёю... мытам і даходам» [3, с. 285]. На сённяшні час атрымалася аднавіць імёны менскіх мытнікаў з канца XV ст. і фактычна за ўсё XVI ст.

Гісторыя, а дакладней Літоўская метрыка, захавала нам імя аднаго з першых менскіх мытнікаў. Ім быў Міхаіл Даніловіч, «троцкі жыд» адкупшчык мыта менскага ў 1489—1491 гг. Ён атрымаў ліст на аренду мыта 10 лютага 1489 г. на тры годы ад Вялікага князя Казіміра «за полосмаста коп грошем широких» [4, с. 53—54]. Пазней, у 1495—1498 гг. адкупшчыкамі мыта Менскага сталі Фёдар Працкевіч і Еўлашка Сцяпанавіч. 13 ліпеня 1498 г. іх змяніў віленскі мешчанін Марцін Янчалевіч, якія арэндаваў мыта менскае да 1500 г., а ў 1504—1506 гг. ён зноў меў дазвол на

яго збор. Трэба адзначыць, што 21 сакавіка 1499 г. Мінск атрымаў Прывілей на Майдэборскае (Магдэбургскае) права. У грамаце пазначалася і права горада на ўтрыманне ўласнай мытніцы. «Теж мыто нашо Менское і з промытою мають мытніки нашы держаті, которім кольвек продадім, во в покоі, подле давного обычаю» [5, с. 86—87]. Цікава, што першым войтам магдэбургскага Менска (кіраўнікам горада) стаў Пётр Шакола, былы смаленскі мытнік [6, с. 416]. Мяркуем, што сёння можна прапанаваць **21 сакавіка 1499 г.** як найстарэйшую дакументальна падцверджанную дату заснавання Мінскай мытні і яе пераемніцы Мінскай рэгіянальнай мытні. Адпаведна бліжэйшы задакументаваны старажытні юбілей мытні 525 гадоў магчыма адзначаць 21 сакавіка 2024 г. У 1501—1503 гг. менскім мытнікам, адкупшчыкам мыта Менскага быў Нісан Есковіч, у 1507-1509 гг. адкупшчыкоў было два — Абрагам Езафовіч і Ян Дзітрыховіч. А. Езафовіч у 1509—1510 гг. зноў стаў менскім мытнікам. Ён быў самым імянітым адкупнікам. Пры Жыгімондзе І у 1514 г. А. Езафовіч быў прызначаны падскарбіем Вялікага Княства Літоўскага і правёў шмат рэформаў ў мытным справе. Напрыклад, ажыццявіў замену натуральных мытных плацяжоў грашовымі. Менскім мытам кіравалі таксама Шамак Данілавіч (1510—1514 гг.) і Нісан Ескавіч (1515—1520 гг., да 1518 г. з Фядко Цуцылам). Ёсць звесткі, што невялікі перыяд да 1522 г. менскае мыто знаходзілася ў «верным кіраванні» [7, с. 445]. У наступныя гады менскім мытам кіравалі: Міхель Езафовіч (1525—1527 гг.), Ілля Машэевіч, пэйсы Айзакавіч, Шахна Галашкевіч (1531—1534 гг.). З 1536 па 1538 г. мытам загадваў «верны» гаспадарскі дваранін Грынашка Шалушыч. А ў 1549 г. менскім мытнікам стаў Фёдар Філіповіч Сечка. Надалей адкупшчыкамі мыта былі: Бордзабагаты Іван, Бордзабагаты Алехна (1553—1556 гг.), Барадаўка Изак — (1560—1562 гг., 1565—1567 гг.).

У 1566 г. Менск стаў цэнтрам ваяводства. Гандаль і маштабы ўзімання мыта набылі большы размах. Напрыклад, кошт арэнды Менскага мыта узрос ад 300 коп грошаў у 1510 г. да 2100 коп грошаў у 1568 г., што сведчыла аб росце аб'ёмаў гандлю і дабрабыту горада [8, с. 235]. У 1569 г. у горадзе было выдзелена месца і пачалося будаўніцтва Гасціннага двара, месца пражывання купцоў, складавання іх тавараў і пабору мыта. У гэты час мытам кіравалі: Ізак Барадаўка (1565—1567 г.), і нават сам Менскі ваявода Мікалай Сапега (1578—1581 гг.), які ў 1578 г. атрымаў у арэнду ўсе мытныя каморы і прыкаморкі ВКЛ, а тасама Хаім Абрамовіч (1582—1584 гг.).

Нажаль, мы пакуль ня ведаем іменаў кіраўнікаў мінскай мытні ў наступных стагодзях. Увагуле, у другой палове XVII — першай палове XVIII стст. горады і мястэчкі Вялікага Княства

перажывалі крызіс, выклiканы спусташальнымі войнамі Рэчы Паспалітай з Расійскай імперыяй і Паўночнай вайной. Колькасць насельніцтва ў княстве катастрафічна зменшылася, знізілася рамесная вытворчасць, рэзка скараціўся гандаль. Мінск апынуўся ў эпіцэнтры падзей. Так, у выніку вайны Расіі з Рэччу Паспалітай у 1656 г. у горадзе пражывала толькі 150 сем'яў. Вялікія бедствы нанесла яму і эпідэмія чумы у 1710-1711 гг. Пасля падобных выпрабаванняў горад даў рады адрадзіцца толькі да сярэдзіны XVIII ст. На XVIII ст. з кіраўнікоў мясцовай мытні нам вядомы толькі адзін Пшысецкі — супэрінтэндант Менскай мытнай каморы ў 1765 г. У студзені 1793 г. у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай Мінск быў далучаны да Расійскай імперыі. Мінская мытня была ліквідавана.

**Беларуская ССР.** За разглядаемы перыяд нам вядома аб дзейнасці 16 чалавек — 6 кіраўніках мытні даваеннага перыяда (1922—1928 гг.) і 10 паваеннага часу (1945—1991 гг.). Трэба адзначыць, што аднаўленная 11 студзеня 1922 г. Мінская мытня адразу апынулася на лідзіруючых пазіцыях. Так, ужо па выніках 1923 г. яна заняла 1-е месца сярод астатніх дзевяці мытных устаноў БССР. У агульнай суме даходаў ад дзейнасці мытных органаў у Рэспубліке гэта склала 56,5 % [9, арк. 395]. У наступныя гады калектыў сталічнай мытні яшчэ не раз быў пераможцам. Першым кіраўніком даваеннай Мінскай мытні стаў латыш Г. Д. Олуп, які з 11 студзеня па 14 ліпеня 1922 г. выконваў гэтыя абавязкі. Ён не меў досведу працы ў мытнай сферы, быў партыйным вылучэнцам, а раней працаваў муляром. 22 жніўня 1922 г. асабіста начальнікам Галоўнага мытнага ўпраўлення (ГМУ) Наркамата знешняга гандлю СССР А. І. Пацяевым кіраўніком мытні быў прызначаны І. Ф. Васільеў, які таксама не меў мытнага досведу. Аднак у лістападзе 1922 г. ён быў зняты з пасады. З 18 снежня в. а. кіраўніка Мінскай мытні прызначаны старшы інспектар Заходняй мытнай акругі А. Б. Вайнберг, які кіраваў ёю да верасня 1923 г. У 1923—1925 гг. яе кіраўніком стаў С. А. Зюлкоўскі. У 1925 г. кароткі час кіраўніком мытні паўторна быў Г.Д. Олуп. З жніўня 1925 г. па 30 мая 1927 г. начальнікам стаў А. М. Глябец. Апошнім кіраўніком Мінскй мытні з 30 мая 1927 г. і да яе ліквідацыі 28 лютага 1928 г. быў Д. І. Паляшчук, прафесійны мытнік, які меў шматгадовы досвед працы ў апараце Беларускага аддзялення ГМУ і кіраўніцтва Негарэлаўскай мытняй. Аднак, пасля амаль сямігадовай паспяховай дзейнасці ў 1928 г. сталічная Мінская мытня рашэннем цэнтральнага кіраўніцтва была ліквідавана.

Фактычна адразу пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны 18 чэрвеня 1945 г. зноў была аднаўлена Мінская мытня. Першым яе начальнікам, з 15 жніўня 1945 г. па сакавік 1946 г., быў

Я. Л. Грынкевіч, які меў досвед мытнай службы з 1922 г. і працаваў начальнікам Казахскага мытнага ўпраўлення ГМУ. За наступныя 10 гадоў на пасадзе кіраўніка мытні змянілася ажно сем чалавек, што не дадавала стабільнасці ў яе працы. Так, з 2 сакавіка 1946 г. некалькі месяцаў яе ўзначальваў Крыцкі, з кастрычніка 1946 г. па 8 чэрвеня 1948 г. — І. П. Сідараў. З 3 ліпеня 1948 г. па 10 чэрвеня 1951 г. мытняй кіраваў Н. І. Смірноў, які меў досвед службы ў Батумскай і Ліепайскай мытнях, пасля ён стаў начальнікам Гродзенскай мытні. З 10 ліпеня 1951 г. па 1952 г. на чале мытні знаходзіўся І. Т. Якаўлеў, былы намеснік начальніка Мінскай мытні, лётчык-франтавік, пасля дэмабілізацыі накіраваны ў мытныя органы. У 1952 г. яго змяніў І. Н. Сініцын, які служыў у мытні з 1946 г. З 1953 г. па май 1954 г. Мінскай мытняй кіраваў М. І. Перасцюк, які пасля стаў начальнікам Брэсцкай мытні. К. Д. Залозны быў начальнікам Мінскага мытнага паста Вільнюскай мытні са жніўня 1955 г. па 1959 г., паста Гродзенскай мытні з 22 мая 1959 г. па 1965 г. і паста Брэсцкай мытні ў 1965—1973 гг. У 1973 г. ягоным начальнікам прызначаны малады інспектар Брэсцкай мытні П. В. Крэчка. 5 жніўня 1975 г. загадам Міністэрства знешняга гандлю СССР Мінскі мытны пост быў пераўтвораны ў мытню. З 31 кастрычніка таго ж года яе ўзначаліў інспектар мытнай службы II рангу П. В. Крэчка. Пазней у гады «Перабудовы» 6 красавіка 1987 г. мытня была пeратворана ў Беларускую тэрытарыяльную мытню (БТМ), якая распаўсюдзіла сваю зону дзейнасці амаль на ўсю тэрыторыю БССР. Яе кіраўніком зноў стаў П. В. Крэчка. 24 лютага 1990 г. яму было ўпершыню ў гісторыі Мінскай мытні нададзена адно з вышэйшых мытных спецыяльных званняў — дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу. З 27 красавіка 1990 г. ён узначаліў Беларускае ўпраўленне Дзяржаўнага мытнага камітэту (ДМК) СССР. Трэба падкрэсліць, што П. В. Крэчкі пазней стаў і першым кіраўніком мытнай службы незалежнай Беларусі. Ён па 16 студзеня 1992 г. паспяхова выконваў абавязкі старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь з 11 лістапада 1991 г. Пасля адстаўкі ў 1999 г. да 2005 гг. быў генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Таліне (Эстонская Рэспубліка) [2, с. 57]. У сувязі са стварэннем Беларускага ўпраўлення ДМК СССР 15 чэрвеня 1990 г. БТМ была перайменаваная ў Мінскую мытню, якую з 23 ліпеня 1990 г. узначаліў В. В. Макарэвіч, дасведчаны кіраўнік з дваццацігадовым стажам працы ў мытнай сістэме. Ен кіраваў ёю да 18 студзеня 1993 г.

Рэспубліка Беларусь. У гэты перыяд кіраўнікамі мытні было 10 чалавек. З 1991 г., ва ўмовах існавання новай незалежнай дзяржавы Мінская мытня была пераўтворана ў Мінскую рэгіянальную (МРМ) і яе ўзначаліў В. В. Макарэвіч з 18 студзе-

ня 1993 г. па 22 ліпеня 1993 г. З 22 ліпеня 1993 г. па 27 снежня 2001 г. — намеснік старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь., в. а. старшыні 30 ліпеня 1997 г. — 13 сакавіка 1998 г.; старшыня ДМК Рэспублікі Беларусь 30 ліпеня 1997 г. Пасля адстаўцы з 1 лістапада 2001 г. працаваў памочнікам Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь. З 1 кастрычніка 1993 г. новым кіраўніком мытні быў прызначаны былы начальнік упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Рэспублікі Беларусь П. М. Кучко, які меў вялікі досвед кіруючай працы і пачынаў сваю мытную кар'еру інспектарам у Мінскай мытні. Ён ўзначальваў мытню досыць працяглы перыяд, да 1 ліпеня 1998 г., і пакінуў прыкметны след у яе гісторыі. У гэты час МРМ увайшла ў склад групы эфектыўна працуючых мытняў і стала, як было адзначана ў 1997 г. у ведамасным часопісе «Таможенный вестник» вядучым падраздзяленнем беларускай сістэмы мытных органаў», а па выніках 1997 г. з 19 мытняў краіны на яе долю прыходзілася амаль 40 % усіх пералічаных у даходную частку рэспубліканскага бюджэту мытных плацяжоў [10, с.10]. Наступным начальнікам мытні стаў былы намеснік начальніка Ашмянскай мытні А. І. Тамашэвіч, які кіраваў ёю з 11 студзеня 1999 г. па 8 красавіка 2002 г. З 19 лютага 2002 г. па 17 красавіка 2003 г. в. а. начальніка Мінскай рэгіянальнай мытні з’яўляўся В. А. Юкевіч. З 9 красавіка 2003 г. яе начальнікам прызначаны Н. П. Бурш, дасведчаны мытнік, які раней быў начальнікам мытні «Мінск-2». Ён пачынаў службу ў мытных органах у 1989 г. інспектарам БТМ, напачатку 1990-х гг. быў начальнікам аддзела па барацьбе з кантрабандай МРМ, з'яўляўся намеснікам начальніка упраўлення МЗС Рэспублікі Беларусь. Н. П. Бурш кіраваў мытняй да 11 кастрычніка 2005 г. З 12 кастрычніка 2005 г. ён — начальнік мытнай інспекцыі, з 10 сакавіка 2008 г. начальнік Упраўленне арганізацыі мытнага кантролю ДМК Рэспублікі Беларусь. 9 жніўня 2010 г. быў звольнены з мытных органаў у парадку пераводу ва Упраўленне справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [2, с. 80].

З 12 кастрычніка 2005 г. новым начальнікам мытні прызначаны А. Я. Бодзіч, які меў вялікі досвед кіраўніцтва Ашмянскай і Верхнядзвінскай мытнямі. Ён быў кіраўніком МРМ да 22 красавіка 2011 г. 22 красавіка 2011 г. на пасаду начальніка Мінскай рэгіянальнай мытні стаў Ю. А. Сянько, кадравы мытнік з 1991 г., які да гэтага доўгі час паспяхова кіраваў Гродзенскай рэгіянальнай мытняй. 6 лістапада 2014 г. ён пакінуў мытню ў сувязі з прызначэннем на пасаду старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь і стаў трэцім па ліку начальнікам МРТ, які ўзначаліў беларускае мытнае ведамства. З 19 лістапада 2020 г. Ю. А. Сянько — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у

Кітаі. 16 снежня 2014 г. начальнікам МРМ стаў А. В. Багдзевіч, які таксама меў вялікі досвед кіруючай працы ў Гродзенскай і Мінскай рэгіянальных мытнях. Ён узначальваў мытню да 22 сакавіка 2016 г. З сакавіка 2016 г. па сакавік 2021 г. быў намеснікам Старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь. З 16 сакавіка 2021 г. — начальнік Аператыўнай мытні. 26 красавіка 2016 г. мытню ўзначаліў А. А. Валіеў, які да гэтага кіраваў Упраўленнем тарыфнага рэгулявання і мытных плацяжоў ДМК Рэспублікі Беларусь. Гэта прафесійны мытнік, які пачаў сваю службу ў 2001 г. з пасады інспектара МРМ. Ён быў начальнікам да 11 сакавіка 2021 г. Важнай падзеяй у гісторыі мытні стала прысваенне яму 25 лютага звання дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу. Упершыню з 1991 г. яе кіраўніком стаў дзяржаўны саветнік мытнай службы.

Увесну 2021 г. кіраўніцтва мытні змянілася. 11 сакавіка А. А. Валіеў быў прызначаны першым намеснікам старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь і 14 мая гэтага года новым кіраўніком стаў С. В. Іваноў, які раней працаваў начальнікам Магілёўскай мытні. Гэта дасведчаны і разнастайна падрыхтаваны кадравы мытнік, які пачынаў сваю службу ў 2001 г. з пасады інспектара Бабруйскага мытнага паста. З 2008 г. ён на кіруючых пасадах. У 2010—2017 гг. быў намеснікам начальніка мытні «Мінск-2». У 2017—2018 гг. намеснік начальніка Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь». З 4 студзеня 2018 г. па 10 чэрвеня 2019 г. — першы намеснік начальніка МРМ. З 2019 па 2021 г. — начальнік Магілёўскай мытні. 21 чэрвеня 2022 г. начальніку Мінскай рэгіянальнай мытні С. В. Іванову было прысвоена персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу.

Такім чынам, Мінская рэгіянальная мытня сёння ўяўляе сабой адну з лепшых мытных установ нашай краіны. Гэта сучасная высокатэхналагічная структура, у якой служаць профессоналы сваёй справы. Але як шматразова сведчыць гісторыя, калектыў прафесіяналаў толькі тады дасягае заўважальных поспехаў, калі яго ўзначальвае мудры і кваліфікаваны кіраўнік.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Саяпин, В. Ю. Таможенная служба. В 2 кн. Кн.2. Борьба с контрабандой / В. Ю. Саяпин. — Гродно: Гроднен. Тип., 2005. — 616 с.
2. Острога В.А., Иванов С.В. История Минской региональной таможни / В. А. Острога, С. В. Иванов. — Минск: РИВШ, 2022. — 172 с.
3. Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т 2. Кадэцкі корпус — Яцкевіч / Рэдкал. Г. П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. — Мінск: БелЭН, 2006. — 792 с.

4. Lietuvos metrika (1479—1491). — Vilnius: Zara, 2004. — 286 p.
5. Литовская Метрика. Книга записей 5 (1427—1506). — Vilnius: Mokslo ir enciklopedij, 1993. — 414 p.
6. Беларусь: Народ. Государство. Время / НАН Беларуси, Ин-т истории; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. — Минск: Белорус. наука, 2009. — 879 с.
7. Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі; падрыхт.: А. І. Груша, Р. А. Аляхновіч. — Мінск: Беларус. навука, 2009. —758 с.
8. Шпілеўская, І. М. З гісторыі мытнай службы Мінска / І. Н. Шпілеўская // Беларус. археаграф. штогоднік. Вып. 2. — 2001. — С. 233—237.
9. Нацыянальны архіў Рэспублікі Белаоусь. — Ф. 129. — Оп. 2. — Д. 54.
10. Косенков, Г. Секрет успешной деятельности в компьютеризации / Г. Косенков // Тамож. вестн. — 1997. — № 7. — С. 10—13.

## ОСОБЕННОСТИ ИДЕНТИФИКАЦИИ ФИЛАТЕЛИСТИЧЕСКИХ И ФИЛОКАРТИЧЕСКИХ МАТЕРИАЛОВ

***Г. М. Власова***
*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, e-mail: GMVlasova97@mail.ru*

*В статье дан анализ современных подходов к разработке методических основ идентификации филателистических и филокартических материалов. Отмечено возросшее значение экспертного обеспечения таможенного контроля данной группы предметов коллекционирования.*
***Ключевые слова:*** *экспертиза; таможенный контроль; филателистические и филокартические материалы.*

## FEATURES OF IDENTIFICATION OF PHILATELIC AND PHILOCARTICAL MATERIALS

***G. M. Vlasova***
*Belarusian State University,*
*Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, e-mail: GMVlasova97@mail.ru*

*The article analyzes modern approaches to the development of methodological foundations for the identification of philatelic and philocartical materials. The increased importance of expert support of customs control of this group of collectibles is noted.*
***Keywords:*** *expertise; customs control; philatelic and philocartical materials.*

Коллекционирование — это систематическое собирание однородных предметов, представляющих научный, исторический, художественный или иной интерес по определенной системе [1]. В настоящее время известно о более чем двухсот зафиксированных видов коллекционирования, среди которых около двадца-